# БОЛЬШЭВІЦКІЯ КЛОПАТЫ

## Нікалай Фёдаравіч ГІКАЛО на будаўніцтве палаца піонераў і окцябрат

Усё лепш і лепш афармляецца палац піонераў. Канчаткова вызвалены ад рыштаванняў, ён выразна выдзяляецца з усіх будынкаў, яго акружаючых. Светлыя фарбы, багатая аддзелка, мрамар, вазы для кветак — усё гэта гаворыць аб тым, што тут будзе дом для дзетвары. Добры атрымаецца палац, прыгожы. Ды інакш і быць не магло. Яго-ж будуе Цэнтральны Камітэт партыі. Няспынна сочыць за будаўніцтвам, па бацькоўску клапоціцца аб ім кіраўнік беларускага народу Нікалай Фёдаравіч Гікало.

Вось і пазаўчора Нікалай Фёдаравіч быў на палацы. Разам з ім палац аглядалі ўпаўнаважаны Камісіі парткантролю па БССР тав. Шуспін, загадчык вытворча-транспартнага аддзела ЦК КП(б)Б тав. Готфрыд, сакратары ЦК ЛКСМБ тт. Манаеў і Мазалеўская, нарком асветы тав. Дзякаў, намеснік наркома тав. Гершон, культпроп гаркома партыі тав. Чыжова.

Нікалай Фёдаравіч спыняўся ў кожным пакоі, уважліва аглядаў яго, не выпускаў з-пад увагі ні малейшай дэталі. У адным месцы ён бярэцца за ручку дзвярэй, разглядвае яе і заключае:

— Ўмывальнік вузкі ды і занадта просты. Ён прапанаваў паставіць добры, салідны ўмывальнік.

У чытальні Нікалай Фёдаравіч звярнуў увагу на мэблю. Ён мацаў яе, прыглядаўся да паліроўкі, да плюшавай абшыўкі. Тут-жа стаялі спецыяльна зробленыя шахматныя столікі. Яны расфарбаваны ў беларускія ўзоры. Уражанне робяць столікі вельмі прыемнае.

— Крэслы, якія будуць стаяць каля гэтых столікаў, таксама расфарбаваць узорамі, афарбаваць пад адзін тон,—прапануе Нікалай Фёдаравіч.

У пакоі окцябрат усе таксама звяртаюць увагу на мэблю. Вось маленькая канапка.

— Грубавата зроблена, — заўважае нехта.

Нікалай Фёдаравіч і ўсе прысутныя згаджаюцца з гэтым. Неабходна добра адпаліраваць, зрабіць больш прыгожай.

Агледзеўшы ўсе паверхі, тав. Гікало і ўсе, яго суправаджаўшыя, выходзяць у сад, які прылягае да палаца. Абходзяць удоўж і папярок велізарны сад. Агромны зялёны масіў, што стварыўся у выніку злучэння некалькіх садоў, багаты пыш- ... звяртаецца Нікалай Фёдаравіч да тав. Гершона. — Мы разгледзім яго ў Цэнтральным Камітэце.

Абышлі кругом і выйшлі супроць фасада.

— Глядзіце, Нікалай Фёдаравіч, які тратуар даў нам горсовет, — скардзіцца тав. Глейберман, указваючы на вузкую палоску, пакрытую бітымі плітамі.

І сапраўды, горсовет заліў асфальтам толькі частку тратуара, якая непасрэдна ахапляе палац. Напроціў-жа ды і навакол асталіся вузкія, разбітыя тратуарчыкі, якія псуюць увесь выгляд. Сорам нашаму горсовету скупіцца для дзяцей. Шкада, што тав. Жуковіча не было — чырванець не было каму.

Прышлося ўсім умясціцца на разбітым горсоветскім тратуарчыку і разглядаць фасад. Прыемнае ўражанне ён стварае, асабліва, калі ярка свеціць сонца.

— Трэба і злева пабудаваць круглую частку, — зазначае тав. Шуспін.

Абавязкова, абавязкова ў другую чаргу пабудуем, — адказвае тав. Гікало.

Пагутарыўшы крыху, Нікалай Фёдаравіч развітаўся і паехаў.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы